38

Выданне „Вольнае Беларусі“.

Дзіцячая чытанка

БЯ 99

МЕНСК.
Друкарня Я. А. Грынблята.
1918.

Инв. 1969 г. 69936

БССР
Дзяржбібліятэка
імя В. І. Леніна
№ 10444

Дзіцячая Чытанка.

БЯ 99
Инв. 1959 г. 69936

Бібліятэка БССР імя В. І. Леніна

МІНСК
1917 г.

ВЫДАННЕ «ВОЛЬНАЕ БЕЛАРУСІ».

1965 г.

Друкарня Н. М. Нахумова (старэйшаго).

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

13 Н/1 237 (026)

ДЗЕД і ЗАЙЧЫК.

Зьлез Дзядок старэнькі с печы,
Сеў і лапцікі абуў,
Апрануў кажух старэчы,
Рукавіцы нацягнуў,
Узяў сякерку і мяшочак
І на луг пашыбаваў.
Падаў мякінькі сьняжочак,
Холад зьлёгка прабіраў.
Дзед ідзе і дым пускае,
Дым густы, як с тэй трубы.
Вецяр, злодзяй, падзімае,

Аж гудуць ў лугох дубы.
Зірк— адкуль ён тут узяўся—
Зайчык выскачыў с кустоў;
Здуру Дзед за ім пагнаўся—
Колісь Дзед лавіў зайцоў.
Ні прабег Дзед і тры крокі—
Бух у снег ён і ляжыць!
Зайчык з радасьці у скокі,
І давай ён з Дзеда кпіць!
— Ты, Дзядок, стары, нідужы:
Дзе табе мяне дагнаць?
Дзед ні спрытны, ніуклюжы...
Памагчы мо табе ўстаць?—
Дзед ляжыць і ўстаць ні можа—
Хітры быў стары Дзядок!
— Ой, прапаў! хто мне паможа?
Плечы ўсе пабіў і бок!—
Тут падскочыў зайчык к Дзеду;
— Будзеш, Дзед, зайцоў лавіць?
Будзеш к панскаму абеду
Брата нашаго насіць?

От цябе ж я закапаю—
I давай ён сънег згрэбаць.
—Я на Дзеда вока маю—
Трэба Дзеда пахавяць!
Тут Дзядок як узварухнецца!
— А пастой жа, галубок!—
Зайчык плача, зайчык рвецца.
— Не, брат, лезь у мой мяшок!
I панёс Дзядок зайчынку.
А каб Дзеда ні займаў,
Меў бы цэлай кажурынку,
Бегаў вольны-б і гуляў.

Якуб Колас.

Дзед і мядзьведзь

Ты паслухай, брат Даніла,
Як дзядок каня шукаў.
Баба ў печы запаліла,
Дзеду сънеданне варыла:
Дым у коміну шугаў
І на двор валіў клубкамі.
Увіхаўся дзед з мяшкамі,
Жыта, грэчку насыпаў.
Баба загодзя казала,
Каб паехаў дзед у млын,
Бо мукі ўжо ні ставало,
Мо было на хлеб адзін.

Вось прыбраў дзядок калёсы,
Колы дзёгцям мазануў,
Нацягнуў тужэй атосы,
Шчыльна загвоздкі заткнуў.
І мяшке паклаў дзядуня—
Дуж дзядок быў і здароў—
І паволі ў хату суне:
Дзед гарачкі ні пароў.
— Ну, што, баба: я гатовы,
Дай пасьнедаць—і у млын.
— Сьнедай, дзедка, еш, здаровы,
Вот і здор табе і блін.
Дзед зірнуў на бабу ласа,
Сеў, пасьнедаў ў самы раз.
— А дзе конь наш, воўча мясо?
Толькі ён мне зводзіць час!—
Выйшаў дзедка на балото.
— Кось-кось-кось!— заве каня.
Ні чутко нідзе, брыдоты!
Дзед прашвэндаўся да дня,
А каня німа і сьледу.

Німа почуту нідзе.
Злосьць старому—шкода дзеду,
Што дарма ён час зьвядзе.
Стало трохі развідняцца.
Зірк дзядок—у грэчцы конь.
І пачаў дзед падкрадацца,
Наплеваўшы на далонь.
Скраўся дзед ды як намкнецца!..
То-ж ні конь быў, а мядзьведзь.
Як раўне ён, як рванецца!
Дзе дзядка яму ўядзець.
Дзед ні меняй за мядзьведзя
Сам спужаўся, сам ні жыў,
Не рашчоміць рук і едзе...
—Тпру!—мядзьведзя ён ныніў.
А мядзведзь аж землю лупіць,
Прэ бяз памяці, ляціць.
Дзеду конь ужо ні рупіць,
Здох-бы лепш ён, воўча сыць.
Так вярсты дзьве дзедка ехаў,
Аж пакуль мядзьведзь ні паў.

Было дзеду ні да съмехаў,—
Сабраць косьці ні жадаў,
І вярнуўшыся да хаты,
Аб тым часта гаварыў.
І мядзьведзя на палатк х
Доўга-доўга зедка сьніў.

Якуб Колас.

ДВА БРАТЫ.

Два браты—Габрусь, Пятрусь
Жылі ў хаці роднай.
Панавала згода ў іх,
Ні злаваў ні воднн.
І на полі, пад стрэхой,
Працавалі шпарка.
І прыкладам ўсім была
Іхня гаспадарка.
Ціхамірны, як адзін,
Працавалі двое;
А як клікнулі на бой,
То пайшлі абое.
Больш яшчэ злучыло іх
Там, на полі бітвы.
Разам ў бой яны ішлі,
Кажучы малітвы.
І зрабілі між сабой
Гэткія умовы:
«Аслабея з іх адзін—

Вызваліць здаровы:
Ні здалея йсьці ад ран—
У помач плечы брата.
Хто памрэ—аддасьць зямлі
Братняя лапата»...
Гэтак на чужых палёх
Разам ваевалі:
У акопах кожну ноч
Разам елі, спалі.
Раз а поўначы пайшлі
Цікаваць, дзе вораг.
Сьцерагліся,—ціха йшлі,
Каб ні чуўся шорах...
Чуць шумеў малы лясок,
Было цёмна ў полі...
Крадучысь, далей—далей,
Йшлі браты паволі...
Вось пачулі людзкі шэпт.
«Відаць, вораг блізка!»
Прыхіліліська да пенька,
Прыхіліліська нізка.

—«О, каб немач!.. вораг тут!
Вынюхаў разведку...»
Выпалілі раз-другі,
Выпалілі метка,
І адважна кожны з іх
У ворага стрэляе.
Шмат хто во-б зямлю упаў,
Шмат хто тут сканае!..
Так хвіль некалькі прайшло
У вагні, ў трывозі.
Зірк Габрусь туды—сюды:
—«Дзе Пятрусь? О, Божэ!»
Чуе стогн... Пятрусь ляжыць,
Жджэ яго апекі...
Брата на сябе ўзваліў,—
З ім Габрусь наўцекі...
У пацёмках ўсё-ж лягчэй
Выйсьці ад бядоты...
На плечах цяжар яшчэ
Дадае ахвоты.
А, тым часам, роі куль

Даганяць хацелі,
Нібы пчолы, увакруг
Лёталі, гудзелі.
Йдзе Габрусь далей, далей:
Рукі, ногі млеюць.
Плечы гне Пятрусь у ніз.
Вельмі ўжо цяжэіць...
Йдзе Габрусь далей, далей,
Брата ні кідае...
Хоць і сам ён чуць жывы—
Брата ўсё-ж трымае.
Сам так ранены—цячэ
Кроў зьмяшана с потам...
—„ Трэба брацяйку нясьці.
Палягчэя потым!“
Правалок так вёрстоў с пяць.
Вось і дзякуй Богу!..
Да акопаў, да сваіх
Есьціка дарога.
І барджэй ён с сваіх плеч
Пятруся спускае,

Моцна туліць да грудзей,
Туліць, прыгартае...
Павіднела увакруг.
Небо ўсё у зорах...
Зірк. Габрусь і—задрыжэў:
— „То ж ні брат, то вораг!“
Габрусь з гора ды з бяды
У плач, як ніпрытомны,
Аж сабе рваў валасы.
Твар зрабіўся цёмны.
—„ О, для ворага свайго
Гэтулькі стараўся!
А мой бедны Пятрусёк
Там ляжаць застаўся.“
А тым часам каля ног
Вораг стогне з мукі:
— Піць... о, піць... о, дайця піць!“
Выстаўляе рукі...
Глянуў на яго Габрусь—
— „Што-ж, і яму цяжка!“
Паднёс ворагу да губ,

І даў выпіць с пляшкі.
І сьпяшыць Габрусь хутчэй
Яго аглядаці.—
Раны добра абвязаў,
Як сястра ці маці.
А пры гэтым думаў ён:
„Там і майго брата
Ворағ поіць, сьцеражэ,
Нібы родны тата."
Хваля радасьці яго
Сэрцо прабірае;
Думка сьветлая ў душы
Сьцежку пракладае;
Загарэўся ён увесь,
Загарэўся пылка:
„Знаць судзіла доля так,
Каб была абмылка.
Супакой сьвяты тады
Стане й між намі,
Калі усе мы на зямлі
Зажывом братамі!"

Ясакар.



КАМАР.

Ой, у лесі, пры даліне,
У нас сталася беда!
Пры даліне, у гушчары,
Калыхаліся камары.
Дуб да дуба нахіліўся,
Камар з дуба зваліўся.
Ой, пабіў сабе бакі
Аб дубовыя сукі.
Ой, пабіў сабе калені
Аб дубовыя карэнні.
Высыпаліся ўсе зубы
С камаровае губы.
Ляціць муха ратаваць,
Зімнай вадой абліваць.
«Камарочку, родны браце,
«Як жэ цябе ратаваці?»
—«Пасылайце да аптэкі,
«Ці ні будзе крыху лепей.
«У бальніцу завязіце
«І мяне там палажыце.

«Там добрыя дактары,—
«Выймуць душу без пары.
—«Камарочку, родны браце,
Дзе ж мне цябе пахаваці?»
—«Ні хавайце пры даліне,
«Бо вырыюць мяне сьвінні,
«Ні хавайце ля дарогі,
«Бо дратаваць будуць ногі.
«Пахавайце у цёмным лесі
«Пры зялёнінькім гарэсі;
«Будуць гарэшкі шчыпаць,
«Камарочка спамінаць:
«А што гэта за чыноўнік,
«Ці енэрал, ці палкоўнік?
«Ні енэрал, ні палкоўнік,
«А сам камар—супакойнік.»

РАК.

(казка.)

Бог тварыў сабе мір. Усе стварэнні прышлі да Яго ды пакланіліся. Бог уставіў кожнай твары вочы, каб усе паглядзелі на яго. Пасьля усіх прыпоўз рак. «Дзе-ж ты, рак-нябарак, валачыўся дагэтуль?» запытаў Бог. «Поркаўся тамака у карчох!» адказаў рак ды ні кланяецца Богу. „Азьмі, рачэ, сабе во гэтыя вочы, якія тутака засталіся!“ сказаў яму Бог. Рак памацаў сваімі клешнямі тыя вочы ды й кінуў іх пад ногі Богу. „Азьмі іх сабе, гэтыя паганыя вочы ды устаў, куды хочаш, а мне іх ні трэба!“ сказаў пагардліва рак ды адвярнуўся к Самому Богу задам. „Дык ні Мне-ж гэтыя вочы трэба, паганы рак, а табе!“ загрымеў Бог ды уставіў раку вочы ў зад.

С тых пор у ўсіх твараў вочы, як вочы, а у рака—з заду.

СІЛО.

Цісвуў мароз, круціла мяцеліца. Паміж гумна і адрыны, дзе на гурбе стаяло сіло, абсыпанае увакол мякінай с каноплямі, было крыху зацішней. Забраліся сюды сьнігір, верабейчык і сініца.

Сьнігір, важна насупырэўшы чырвоны свой валяк дый пасьвістываючы, як і увесь свой век рабіў, стаў падбірацца да канапель.

Дзюбануў раз, другі асьцярожна, але, разласэваўшыся, апанавала яго такая прагавітасьць, што улез на самую сярэдзіну сіла ды давай малаціць, аж покуль петля ні зацісвула яму шыі.

„Чык-чы-рык!“ усьцешыўшыся, пачала зьдзекавацца над ім сініца, бо за сьнігіром сама баялася дастуніцца да канапель. «Чык-чы-рык!» —крычала яна, увіхаючыся каля зернят, дый ні агле-

дзілася, як сама абедзьве ногі уплутала у валасянку.

«Жыў-жыў-жыў!» адазваўся верабейчык, скачучы здалёку сіла і набіваючы мякінай свой валяк. «Жыў-жыў-жыў!»

Ядвігін Ш.

Дабраноч.

Зайшло ужо сонцо,
Скончыуся дзень,
Зарніца небо малюе.
На землю ночы
Зыходзе цень,
Ціша усюды пануе.
Дабраноч, яснае сонцо!
Дабраноч, маці зямліца!
Дабраноч, сіняе небо,
Дабраноч, зорка-зарніца.
Дабраноч!



Заяц і жабы.

Забедавауся, заплакауся малы шэры зайчык, седзючы пад кусьцікам:

— Бедны я, малы шэры зайчык! Усе мяне крыудзюць, усе пада мной зьдзекуюцца. Хто толькі ні хочэ мяне зьесьці? І мядзьведзь, і воук, і сабака, і сава, і каршун, і чалавек. Ад усіх мне трэба хавацца, усе мне ворагі. А мяне — ніхто ні баіцца, бо бараніцца я ніяк ні умею; адна мая абарона — гэта мае спрытныя і шпаркія ногі. Яны мяне ратуюць у бядзе. Надакучыло мне ужо гэткае жыцце, пайду у рэчку,—утаплюся.

І пашоу заяц пад рэчку тапіцца. Падышоу на бераг, думае кінуцца у воду. Ажпа тут жабы—скік, скік,—уцекаюць, спудзіушыся зайца, па усе бакі.

Усьцешыуся заяц, што ёсьць і такія стварэнні, якія і яго баяцца. І ужо ні тапіуся, а хадзіу каля рэчкі і жабы палохау.

Мядзьведзь.

(Казка.)

Было гэта дауно. Бог са сваімі сьвятцамі ішоу па дарозі. Усе людзі кланяліся яму, а адзін галуза-безбацькавіч стау дражніцца. Сьвятцы доуга угаварвалі гэтаго галузу, ды ен іх ні слухау. То з аднаго боку кінецца на Бога, то з другога, а Бог ідзе усе сваею дарогай і ні глядзіць на яго

Тады галуза забег наперад, схавауся за явары-ну і сядзіць. А Бог ідзе сабе ціхінька па дарозі, а за ім сьвятцы. Толькі што яны параунялiся з яварынай, як адтуль выскачыу галуза, прысеу на карачкі, выцягнуу морду ды на Бога: «гы-ы-ы!»

Ні стау цярпець боляй гэтаго Бог і сказау: «Увесь свой век ты хадзіць меш так, як ціперака ходзіш!»

С тых пор і ходзіць той галуза мядзьведзям на карачках, выставіушы морду.

Хлеб.

(Казка.)

Стау ганяць стараста Пранука ажна у паветовы горад адбываць там нейкія павіннасьці. — «Ах, каб з вас духі павыганяло!» —- замармытау пад нос Пранук, але т-кі, хоцькі-ні-хоцькі, закінуушы на плечы торбу с хлебам, пацягнууся.

Раніцай—халадком—ісьці было нішто, але пад поудня стало прыпекаць, ногі пачалі млець, а тут ішчэ вяровачка ад торбы с хлебам муляе плечы Пранука. А у дарозі, вядомая рэч: зразу зусім ні чутно цiжару, а прайдзі толькі далей, дык і хунт пудам здаецца!

Перакідывау Пранук торбачку з аднаго плеча на другое, перакідывау ды й так нічога: рэжэ!

— Вось, каб цябе ліхо! — стау нарэкаць Пранук: — сам чуць цягнуся, а тут ішчэ і хлеб нясі...

— Ні ты мяне нясеш, а я цябе нясу, — адзываецца хлеб с торбы.

Забыуся Пранук і на дзіво, што хлеб загаварыу, толькі ішчэ горш узлавауся:

— Дык ты гэтак?! Мала таго, што на плячох маіх ляжыш, — ішчэ агрызацца уздумау? Вось жэ паглядзім, хто каго нясе! — Ды й бразь торбу з хлебам воб-зямлю, а сам ажно ходу са злосьці падбавіу.

Ішоу Пранук, ішоу доуга; але што раз часьцей садзіуся спачываць, што раз часьцей уздыхау, што раз часьцей сплёвывау і, ні прыжджаушы яшчэ вечара, вельмі усьцешыуся, угледзіушы здалёку на дарозе карчму,

Зайшоў, дастаў капшук, вытрас з яго апошнюю залатоўку, што з дому ўзяў, ды аддаў яе на хлеб і, ласа сухі яго грызучы, дагадаўся ўрэшці, хто каго нес: ці еп хлеб, ці хлеб яго?

Ядвігін Ш.

Дудар.

Тром родным братом Бог даў аднакі розум, аднакія мысьлі і думкі. Толькі ні аднакая доля спаткала кожнаго брата у жыцці. Хоць усім братом ні вельмі соладка жылося, але меншаму брату выпала самая горшая доля. Прысудзіла яна яму самы горшы куток, кінула між мхоў і балот. Кепска жылося меншаму брату. Плакаў ён, і ніхто ні бачыў яго сьлёз, ці ні хацеў бачыць. Сьпеваў ён песьні—доўгія, нудныя песьні—песьні нядолі. Гаварыў і казкі, і толькі у казках ён бачыў сябе шчасьлівым. Яго сьлёзы капалі разам з расой на зямлю. Грэло сонцо, і сьлёзы, зьмешаныя з Божай расой, падымаліся к небу і адтуль кідаліся назад на зямлю чыстымі капелькамі. І так яны вечна кружацца з зямлі на небо, з неба на зямлю. І ніколі ні высыхалі вочы меншаго брата. Тоўсты, высокі лес адзін толькі слухаў яго песьні і сам памагаў яму сьпеваць сваім доўгім шумам. Выходзіў меншы брат у вечар на двор, браў сваю дудку, садзіўся на прызьбі свае хаты і граў. Месячык каціўся па небі, плылі белыя хмаркі. Божыя зоркі, як саромлівыя дзеўчаткі, пазіралі на зямлю праз белыя, тонкія хмаркі і слухалі меншаго брата, як граў ён на дудцы. І ціха было на сэрцы, як ціха была сама ночка. І думкі, як тыя хмаркі, лёгка радзіліся у сэрцы і плылі яны Бог знае куды, далёка-далёка, уміралі ціха-ціха, як паволі растаівалі і белыя хмаркі у небі. Толькі пугач і сава злым крыкам сваім будзілі ад шчасьлівых думак меншаго брата. Ен прачыхаўся, як ад сну, і думкі другія, думкі нядолі, як нажом, калолі яму у сэрцо.

Ні думак, ні песянь яго ніхто ні знаў і ні чуў, ці ні хацеў знаць і чуць. Яго жальба прападала, як прападаў туман з усходам сонца, што вісеў над балотам. Разьбіраў яго адзін толькі лес і лесу адкрываў меншы брат свае думкі, бо людзі сьмяяліся з яго слоў і песянь. А з лесам жылося вальней: лес ні душыў яго, ні гнаў, як гналі і душылі яго людзі. І меншы брат зрабіўся ціхі, спакойны, асьцярожны і нікому ні адкрываў свае душы. Меншы брат адзічэў. Лес і балоты адгарадзілі яго ад Божаго сьвету.

Прайшло многа часу. Усе тры браты сустрэліся. Старшы брат пазіраў сьмела. Ен быў у ботах, у крамных портках і кашулі, а паверх кашулі—камізэлька. Гаварыў старшы брат скора, мова яго была адменна, і меншы брат ледзьве мог разьбіраць яго.

На сярэднім браце была высокая шапка, шырокія белыя порткі, боты. У зубах круглая люлька на кароткім цыбуку; гаварыў ён мала.

Меншы браг выглядаў старэйшы за іх абодвых. Барада яго была сівая, рукі дрыжалі. Сам ён быў тонкі, худы. Яму як бы брыдка было перад братамі, што на ім сівая рваная сьвітка, круглая шапка-кучомка; на нагах лапці, а каравыя анучы абвівалі худыя ногі.

Гаварылі браты аб усім: а горкай сваёй долі, а праўдзе, а жыццю.

Меншы брат маўчаў. Яму ні давалі гаварыць тэй мовай, каторэй гаварыў ён сам с сабой, с сваімі думкамі, з лесам. З яго мовы сьмяяліся старшыя браты.

— Гавары ты так, як гавару я,—кажэ старшы брат, —і ні страхай ты мову людзкую. Твая мова—нямая мова.

Што сказаў ты сьвету на сваёй мові? Дзе песьні твае? Хто чытаў твае думкі, работу твайго розуму і сэрца? Дзе песьняры твае? Чым ты пахвалішся?

— Лепшай мовы я ні чуў. Гавару, як знаю. Брат! Хто доўга маўчаў, таму хочацца многа гаварыць. А я маўчаў усё жыццё, і мне хочацца гаварыць; ні адбірай ты ад мяне хоць гэтаго права. Спытайся у хваёвых крыжоў, яны табе скажуць пра мае думкі. Мае думкі напісаны сьлязьмі, а сьлёзы разам з думкамі разліліся у рэчцы. Вецяр — песьняр мой. Горо і боль радзілі мае песьні і слухаў іх лес. Спытайся у лесу — ён скажэ пра песьні мае.

Скажу табе казку. Пасадзіў пан дудара у глыбокім склепі за каменныя сьцены. Кажэ яму пан: «Грай мне на дудцы, каб я чуў твае песьні, і тагды я пазволю табе сьпеваць людзям песьні, дарую право разсказаць сьвету пра думкі твае.»

Праз каменныя сьцены ні выбілася песьня дудара і ніхто яго ні пачуў. — «Ты павінен маўчаць! — кажэ пан дудару — бо песьня твая нічога ні сказала майму сэрцу. Ніхай астаюцца у табе твае думкі і песьні.» І дудара с таго часу слухало пустое поле, балото ды лес.

Брат! Мы усе шукалі шчасьця, толькі ішлі мы ні аднакімі дарогамі. Табе хоць трохі сьвяціло сонцо, а я ішоў, як у ночы. Запалім жэ мы ішчэ лучыны і пойдзем ішчэ шукаць долі, будзем памагаць адзін аднаму, а як заблудзіць хто з нас, падамо яму голас. Ні сьмейцеся ж, браты, і ні адбірайце ад мяне таго, што можа адабраць толькі Бог!

І сьлёзы блішчэлі на вачах меншаго брата.

Тарас Гушча.

Да работы.

Гэй, хутчэй, хутчэй у поле,
Гэй, грамада цэла!
Трэба добра гараць поле,
Каб хлеб радзіў белы.
    Гэй, за плугі, за бароны,
    Хутчэй да работы,
    Каб хваціла на дзень цэлы
    Да працы ахвоты.
Радзі, Божэ, хлябок белы
Для нас і худобы!
Гэй, за плугі, за бароны,
У поле хлебаробы!

Цана 50 кап.